МИНСКИЙ ОБЛИСПОЛКОМ
ДЗЕРЖИНСКИЙ РАЙОННЫЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
ГОСУДАРСТВЕННАЯ РЕГИСТРАЦИЯ
Регистрационный номер 690340996
05.12.2022
дата подпись
Кондратьева К.И.
фамилия, инициалы

ЗАЦВЕРДЖАНА

Рашэнне
Дзяржынскага раённага
выканаўчага камітэта
28 НОЯ 2022 № 2654

Управление делами

# СТАТУТ
дзяржаўнай установы адукацыі
«Дварышчанская сярэдняя школа Дзяржынскага раёна»

(Дварышчанская сярэдняя школа Дзяржынскага раёна)

# УСТАВ
государственного учреждения образования
«Дворищанская средняя школа Дзержинского района»

(Дворищанская средняя школа Дзержинского района)

аг.Дворище, 2022

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Сапраўдны статут (далей - Статут) з'яўляецца Статутам дзяржаўнай установы адукацыі «Дварышчанская сярэдняя школа Дзяржынскага раёна» (далей – Установа).

2. Установа ўваходзіць у сістэму адукацыі Рэспублікі Беларусь.

3. Поўная назва Установы:

на рускай мове: государственное учреждение образования «Дворищанская средняя школа Дзержинского района»;

на беларускай мове: дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дварышчанская сярэдняя школа Дзяржынскага раёна».

Скарочаная назва Установы:

на беларускай мове: Дварышчанская сярэдняя школа Дзяржынскага раёна;

на рускай мове: Дворищанская средняя школа Дзержинского района.

4. Месцазнаходжанне Установы: 222721, Мінская вобласць, Дзяржынскі раён, аграгарадок Дворышча, вуліца Цэнтральная, д. 34А.

5. Заснавальнікам Установы з'яўляецца Дзяржынскі раённы выканаўчы камітэт (названы ў далейшым - Заснавальнік). Месца знаходжання Заснавальніка: 222712, Рэспубліка Беларусь, Мінская вобласць, горад Дзяржынск, плошча Дзяржынскага, дом1.

Органам дзяржаўнага кіравання, які ўпаўнаважаны Заснавальнікам, з'яўляецца ўпраўленне па адукацыі, спорце і турызме Дзяржынскага раённага выканаўчага камітэта (далей - Упраўленне).

6. Паўнамоцтвы ўласніка ў дачыненні да дзяржаўнай маёмасці Установы ажыццяўляе Заснавальнік. Установа з'яўляецца некамерцыйнай арганізацыяй. Фінансуецца Установа са сродкаў бюджэту Дзяржынскага раёна.

7. Установа ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Грамадзянскім кодэксам Рэспублікі Беларусь, Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, дэкрэтамі, указамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі, Палажэннем аб установе дашкольнай адукацыі, іншымі актамі заканадаўства, нарматыўнымі актамі, якія выдаюцца ў адпаведнасці з іх кампетэнцыяй органамі адукацыі і іншымі органамі дзяржаўнага кіравання, рашэннямі мясцовых органаў улады, а таксама дадзеным Статутам.

8. Тып Установы: установа агульнай сярэдняй адукацыі.

Від Установы: сярэдняя школа.

9. Установа функцыянуе ў складзе I-XI класаў, груп для выхаванцаў ранняга і дашкольнага ўзросту, рэалізуе адукацыйную праграму агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, а таксама можа рэалізоўваць адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, у мэтах спартыўнай падрыхтоўкі вучняў можа арганізоўвацца вучэбна-трэніровачны працэс па відах спорту.

Установай можа ажыццяўляцца прафесійная падрыхтоўка вучняў праз рэалізацыю адукацыйнай праграмы прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых) і дапрафесійнай падрыхтоўкі.

Установа рэалізуе праграму выхавання і абароны правоў і законных інтарэсаў дзяцей, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы; праграму выхавання дзяцей, якія маюць патрэбу ў аздараўленні.

10. Установа з'яўляецца юрыдычнай асобай, мае пячатку з выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, штамп са сваёй назвай.

11. Установа мае права адкрываць ва ўстаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь парадку бягучыя, разліковыя і іншыя рахункі ў банках Рэспублікі Беларусь у замежнай валюце і беларускіх рублях.

12. Установа адказвае па сваіх абавязках грашовымі сродкамі, якія знаходзяцца ў яе распараджэнні. Пры іх недастатковасці субсідыярную адказнасць па яго абавязках нясе ўласнік маёмасці.

13. Установа мае ў аператыўным кіраванні адасобленую маёмасць, нясе самастойна адказнасць па сваіх абавязках, можа ад свайго імя набываць і ажыццяўляць маёмасныя і немаёмасныя правы, выконваць абавязкі, быць істцом і адказчыкам у судзе.

14. Установа ва ўстаноўленым парадку вядзе справаводства на рускай або беларускай мове, прадстаўляе звесткі, прадугледжаныя заканадаўствам, у падатковыя і іншыя органы дзяржаўнага кіравання ў адпаведнасці з іх кампетэнцыяй.

15. Установа не мае права выступаць гарантам або паручыцелем трэціх асоб - юрыдычных асоб недзяржаўнай формы ўласнасці (у тым ліку долі (акцыі) у статутных фондах якіх знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці) і фізічных асоб (у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў) па выкананні гэтымі асобамі сваіх абавязкаў

па вяртанні крэдытаў, прадастаўленых банкамі і нябанкаўскімі крэдытна-фінансавымі арганізацыямі.

16. Установа ў сваёй рабоце ўзаемадзейнічае з іншымі ўстановамі адукацыі, установамі дадатковай адукацыі, культуры, навукі, органамі аховы здароўя, унутраных спраў, па надзвычайных сітуацыях, службай занятасці насельніцтва і іншымі дзяржаўнымі і недзяржаўнымі арганізацыямі.

17. Ва Установе не дапускаецца стварэнне і дзейнасці палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, якія маюць палітычныя мэты, а таксама стварэнне і ананімная або іншая дзейнасць рэлігійных арганізацый, якая супярэчыць заканадаўству.

18. Установа ў пытаннях выхавання на падставе пісьмовых заяў навучэнцаў (законных прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў) у пазаўрочны час можа ўзаемадзейнічаць з зарэгістраванымі рэлігійнымі арганізацыямі з улікам іх уплыву на фарміраванне духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа. Парадак, умовы, змест і формы такога ўзаемадзеяння вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

19. Установа можа ажыццяўляць міжнародную дзейнасць у адпаведнасці з міжнароднымі пагадненнямі Рэспублікі Беларусь і заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

20. Установа можа быць абмежавана ў правах толькі ў выпадках і парадку, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

## ГЛАВА 2
## ПРАДМЕТ, МЭТЫ І ЗАДАЧЫ ДЗЕЙНАСЦІ УСТАНОВЫ

21. Прадметам дзейнасці Установы з'яўляецца рэалізацыя адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі на ўзроўне дашкольнай адукацыі, адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, праграмы выхавання і абароны правоў і законных інтарэсаў дзяцей, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, праграмы выхавання дзяцей, якія маюць патрэбу ў аздараўленні.

Прадметам дзейнасці Установы пры рэалізацыі праграмы дашкольнай адукацыі з’яўляецца навучанне і выхаванне дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту.

22. Асноўнымі мэтамі дзейнасці Установы з'яўляюцца:

стварэнне ўмоў для рэалізацыі права грамадзян на адукацыю;

фарміраванне ведаў, уменняў, кампетэнцый, навыкаў і інтэлектуальнае, маральнае, творчае і фізічнае развіццё асобы навучэнца;

фарміраванне рознабакова развітай, маральна сталай, творчай асобы навучэнца, фарміраванне грамадзянскасці і патрыятызму, інтэлектуальнае, духоўна-маральнае, творчае, фізічнае і прафесійнае развіццё асобы навучэнца.

23. Асноўнымі задачамі Установы з'яўляюцца:

павышэнне якасці адукацыі;

стварэнне ўмоў для рэалізацыі задач выхавання;

павышэнне ўзроўня прафесійнай кампетэнцыі педагогаў;

паляпшэнне матэрыяльна-тэхнічнай і вучэбна-метадычнай базы ў адпаведнасці з устаноўленымі санітарнымі нормамі і правіламі.

24. Мэтай выхавання з’яўляецца фарміраванне ўсебакова развітай, маральна сталай, творчай асобы навучэнца.

25. Задачы выхавання:

фарміраванне грамадзянскасці, патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці на аснове дзяржаўнай ідэалогіі;

падрыхтоўка да самастойнага жыцця, прафесійнага самавызначэння, выбару прафесіі і працы;

фарміраванне маральнай, эстэтычнай культуры і культуры ў галіне аховы навакольнага асяроддзя і прыродакарыстання;

фарміраванне фізічнай культуры, авалоданне каштоўнасцямі і навыкамі здаровага ладу жыцця;

фарміраванне культуры сямейных адносін;

стварэнне ўмоў для сацыялізацыі, самаразвіцця і самарэалізацыі асобы навучэнца.

26. Асноўнымі складальнікамі выхавання з’яўляюцца:

ідэалагічнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў ведаў, асноў дзяржаўнай ідэалогіі, прывіццё падрастаючаму пакаленню агульначалавечых, гуманістычных каштоўнасцей, ідэй, перакананняў, якія адлюстроўваюць сутнасць беларскай дзяржаўнасці;

грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў актыўнай грамадзянскай пазіцыі, патрыятызму, прававой, палітычнай і інфармацыйнай культуры;

духоўна-маральнае выхаванне, накіраванае на далучэнне навучэнцаў да агульначалавечых і гуманістычных каштоўнасцей, фарміравання маральнай культуры;

эстэтычнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў эстэтычнага густу, развіццё пачуцця прыгожага;

выхаванне псіхалагічнай культуры, накіраванае на развіццё, самаразвіццё і самарэалізацыю асобы навучэнца;

выхаванне фізічнай культуры, фізічнае ўдасканальванне;

фарміраванне ў навучэнцаў навыкаў здаровага ладу жыцця, асэнсавання значнасці здароўя як каштоўнасці і важнасці яго захавання;

сямейнае і гендэрнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў адказных адносін да сям'і, шлюбу, выхавання дзяцей, асэнсаваных уяўленняў аб ролі і жыццёвым прызначэнні мужчын і жанчын у адпаведнасці з традыцыйнымі каштоўнасцямі беларускага грамадства;

працоўнае і прафесійнае выхаванне, накіраванае на разуменне навучэнцамі працы як асабаснай і сацыяльнай каштоўнасці, фарміраванне гатоўнасці да асэнсаванага прафесійнага выбару;

выхаванне, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў беражлівых адносін да навакольнага асяроддзя і прыродакарыстання;

выхаванне культуры бяспекі жыццядзейнасці, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў бяспечных паводзін у сацыяльнай і прафесійнай дзейнасці;

выхаванне культуры быту і вольнага часу, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў каштоўнасных адносін да матэрыяльнага наваколля, умення мэтанакіравана і эфектыўна выкарыстоўваць вольны час;

полікультурнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў талерантных адносінаў да прадстаўнікоў іншых культур, нацыянальнасцей, веравызначэнняў;

эканамічнае выхаванне, накіраванае на фарміраванне ў навучэнцаў эканамічнай культуры асобы.

27. Задачы пры рэалізацыі праграмы дашкольнай адукацыі:

ахова жыцця і ўмацаванне фізічнага і псіхічнага здароўя выхаванцаў;

забеспячэнне рознабаковага развіцця асобы выхаванца ў адпаведнасці з яго ўзроставымі і індывідуальнымі магчымасцямі, здольнасцямі і патрэбамі;

фарміраванне ў выхаванцаў маральных нормаў, кампетэнцый, неабходных для набыцця сацыяльнага вопыту;

падрыхтоўка да працягу навучання;

аздараўленне.

28. Асноўнай функцыяй Установы пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі з’яўляецца стварэнне ўмоў для:

навучання і выхавання, ранняй сацыялізацыі выхаванцаў;

засваення зместу адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі дома для выхаванцаў, якія па медыцынскіх паказчыках пастаянна не могуць наведваць установу;

атрымання адукацыі выхаванцамі з асаблівасцямі псіха-фізічнага развіцця і аказання ім карэкцыйна-педагагічнай дапамогі;

фізічнага, сацыяльна-маральнага, асобаснага, пазнавальнага, моўнага і эстэтычнага развіцця выхаванцаў;

фарміравання ў выхаванцаў грамадзянскасці і нацыянальнай самасвядомасці, асноў патрыятызму, традыцыйных каштоўнасных установак;

далучэння выхаванцаў да агульначалавечых каштоўнасцяў і сучасных традыцый;

развіцця ў выхаванцаў агульных і спецыяльных здольнасцей да розных відаў дзейнасці і творчасці;

выяўлення і развіцця індывідуальных здольнасцей выхаванцаў і іх інтэлектуальна-творчага патэнцыялу;

забеспячэння пераемнасці дашкольнага і I ступені агульнай сярэдняй адукацыі;

арганізацыі харчавання і аказання медыцынскай дапамогі выхаванцам;

забеспячэння сацыяльна-педагагічнай падтрымкі выхаванцаў і аказання ім псіхалагічнай дапамогі.

29. Установа ажыццяўляе адукацыйную дзейнасць з моманту атрымання спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) на ажыццяўленне адукацыйнай дзейнасці;

стварае структурныя падраздзялення і (або) адасобленыя структурныя падраздзяленні;

распараджаецца маёмасцю, замацаванай за ёй на праве аператыўнага кіравання, у парадку, устаноўленым заканадаўствам;

ажыццяўляе дзейнасць, якая прыносіць даходы, калі яна адпавядае прадмету, мэтам дзейнасці і задачам Установы і неабходная для выканання яго функцый;

распараджаецца сродкамі, атрыманымі ад дзейнасці, якая прыносіць даходы, а таксама набытай за кошт такіх сродкаў маёмасцю ў адпаведнасці з заканадаўствам;

забяспечвае ва ўстаноўленым парадку прыём навучэнцаў ва Установу;

ажыццяўляе ў межах сваёй кампетэнцыі адміністрацыйныя працэдуры;

разглядае ў межах сваёй кампетэнцыі і ў парадку, устаноўленым заканадаўствам, звароты грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, а таксама юрыдычных асоб.

30. Ва Установе ажыццяўляецца навучанне і выхаванне на ўзроўнях дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі.

Структура Установы наступная:

дашкольная адукацыя;

агульная сярэдняя адукацыя, якая ўключае:

I ступень – пачатковая адукацыя (I-IV класы);

II ступень – базавая адукацыя (V-IX класы);

III ступень – сярэдняя адукацыя (X - XI класы).

31.Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі ажыццяўляецца ў групах, у тым ліку санаторных групах, інтэграванага навучання і выхавання, або індывідуальна.

Дашкольная адукацыя – узровень асноўнай адукацыі, накіраваны на рознабаковае развіццё асобы дзіцяці ранняга і дашкольнага ўзросту ў адпаведнасці з яго ўзроставымі і індывідуальнымі магчымасцямі, здольнасцямі і патрэбнасцямі фарміравання ў яго маральных нормаў, кампетэнцый, неабходных для набыцця сацыяльнага вопыту, падрыхтоўкі да працягу адукацыі, аздараўлення дзіцяці.

Тэрмін атрымання дашкольнай адукацыі вызначаецца законнымі прадстаўнікамі выхаванцаў. Пры гэтым тэрмін засваення зместу праграмы дашкольнай адукацыі складае да пяці гадоў дзесяці месяцаў і можа быць павялічаны на адзін год па жаданні законных прадстаўнікоў выхаванцаў.

Выхаванцы размяркоўваюцца на тры рознаўзроставыя групы (ад двух да чатырох гадоў, ад трох да шасці гадоў, ад пяці да сямі гадоў).

Для арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі ў якасці структурнага падраздзялення можа ствараецца яслі-сад, а пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі і ажыццяўленні аздараўлення дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту – санаторны яслі-сад.

32. Ва ўстанове адукацыі пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі ўстанаўліваюцца канікулы, у час якіх заняткі з выхаванцамі не праводзяцца. У час канікулаў праводзяцца мерапрыемствы фізкультурна-аздараўленчай і мастацка-эстэтычнай накіраванасці. Агульная працягласць канікулаў складае сто дванаццаць каляндарных дзён: летнія – дзевяноста два каляндарныя дні; зімовыя – дзесяць каляндарных дзён; вясеннія – дзесяць каляндарных дзён.

33. Ва Установе ажыццяўляецца навучанне і выхаванне на I, II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі.

34. Пачатковая адукацыя (I ступень) – тэрмін навучання і выхавання складае чатыры гады. На I ступені агульнай сярэдняй адукацыі рэалізуецца адукацыйная праграма пачатковай адукацыі, засваенне зместу якой з'яўляецца абавязковым.

35. Базавая адукацыя (II ступень) – тэрмін навучання і выхавання складае пяць гадоў. На II ступені агульная сярэдняй адукацыі рэалізуецца адукацыйная праграма базавай адукацыі, засваенне зместу якой з'яўляецца абавязковым.

Тэрмін атрымання агульнай базавай адукацыі складае дзевяць гадоў.

36. Сярэдняя адукацыя (III ступень) – тэрмін навучання і выхавання складае два гады. На III ступені агульная сярэдняй адукацыі рэалізуецца адукацыйная праграма сярэдняй адукацыі, засваенне зместу якой з'яўляецца абавязковым.

Тэрмін атрымання агульнай сярэдняй адукацыі складае адзіннацаць гадоў.

Агульная сярэдняя адукацыя дае права на працяг навучання на ўзроўнях прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі.

37. Тэрмін атрымання агульнай базавай адукацыі складае 9 гадоў (для асоб з асаблівасцямі псіха-фізічнага развіцця - 9 - 10 гадоў); агульнай сярэдняй адукацыі - 11 гадоў (для асоб з асаблівасцямі псіха-фізічнага развіцця - 11 - 12 гадоў).

Тэрміны навучання на ступенях агульнай сярэдняй адукацыі складаюць: на I ступені - 4 гады (для асоб з асаблівасцямі псіха-фізічнага развіцця - 4 - 5 гадоў); на II ступені - 5 гадоў; на III ступені - 2 гады.

38. Тэрмін атрымання дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі вызначаецца вучэбна-праграмнай дакументацыяй адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

39. Навучанне ва Установе арганізавана ў вочнай форме атрымання адукацыі.

40. Установа мае права на распрацоўку і правядзенне ва ўстаноўленым парадку эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці па ўжыванні новага зместу навучання і выхавання, новых педагагічных сістэм, якія фарміруюцца на прынцыпах бесперапыннасці з іншымі відамі адукацыі.

41. Для дасягнення мэтаў дзейнасці Установы і задач, якія на яго ўсклалі, Установа абавязана забяспечваць:

якасць адукацыі;

распрацоўку і зацвярджэнне ва ўстаноўленым парадку структурных элементаў, навукова-метадычнага забеспячэння адпаведнай адукацыі, яго ўдасканаленне;

падбор, прыём на працу і расстаноўку кадраў, павышэнне іх кваліфікацыі;

матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу ў адпаведнасці з устаноўленымі санітарнымі нормамі, правіламі і гігіенічнымі нарматывамі;

стварэнне бяспечных умоў пры арганізацыі адукацыйнага працэсу;

распрацоўку і прыняцце правілаў унутранага распарадку для навучэнцаў, правілаў унутранага працоўнага распарадку Установы;

маральнае і матэрыяльнае стымуляванне навучэнцаў, педагагічных і іншых работнікаў Установы;

меры сацыяльнай абароны навучэнцаў;

стварэнне бяспечных умоў для арганізацыі харчавання і медыцынскай дапамогі.

42. У адпаведнасці з пэўнымі мэтамі і задачамі Установа ажыццяўляе віды дзейнасці згодна з агульнадзяржаўным класіфікатарам Рэспублікі Беларусь АКРБ 005-2011 “Віды эканамічнай дзейнасці”.

Установа рэалізуе наступныя віды дзейнасці: 85310 - агульная сярэдняя адукацыя; 85100 - дашкольная адукацыя: 88910 - дзённы догляд за дзецьмі; 85600 - дапаможныя адукацыйныя паслугі; 85200 - пачатковая адукацыя; 85590 - другія віды адукацыі, не ўключаныя ў іншыя групоўкі; 91020 - дзейнасць музеяў; 91011 - дзейнасць бібліятэк; 94990 - дзейнасць іншых арганізацый, заснаваных на членстве, не ўключаных у іншыя групоўкі; 85510 - адукацыя ў галіне спорту і адпачынку.

Віды дзейнасці, якія падлягаюць ліцэнзаванню, ажыццяўляюцца Установай пасля атрымання адпаведнага дазволу (ліцэнзіі), ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку.

43. Права ажыццяўляць дзейнасць, на заняткі якой неабходна атрыманне ліцэнзіі, узнікае з моманту атрымання ліцэнзіі ва ўказаны ў ёй тэрмін і спыняецца па заканчэнні тэрміну яе дзеяння, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам.

44. Установа можа забяспечваць вывучэнне асобных вучэбных прадметаў на павышаным ўзроўні пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, вывучэнне асобных вучэбных прадметаў на павышаным узроўні ў рамках арганізацыі профільнага навучання пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі.

45. Установа можа рэалізоўваць адукацыйную праграму прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых), ствараць умовы

для арганізацыі вучэбна- трэніровачнага працэсу ў мэтах падрыхтоўкі спартыўнага рэзерву.

46. У выпадках, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, клас можа дзяліцца на групы.

47. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі носіць карэкцыйную накіраванасць і арганізуецца з улікам структуры і ступені цяжкаці парушэнняў у фізічным і (або) псіхічным развіцці і ўзроста навучэнцаў на аснове вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм спецыяльнай адукацыі.

48. Пункт карэкцыйна-педагагічнай дапамогі ў сваёй дзейнасці кіруецца дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Арганізацыя і функцыянаванне пунктаў карэкцыйна-педагагічнай дапамогі спецыяльных класаў для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і класаў інтэграванага навучання ва Установе ажыццяўляецца ў адпаведнасці з актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

49. У мэтах індывідуалізацыі і дыферэнцыяцыі навучальнага працэсу па жаданні вучняў і іх законных прадстаўнікоў могуць арганізоўвацца факультатыўныя заняткі (I -XI класы).

50. Вывучэнне вучэбных прадметаў на базавым, павышаным ўзроўнях ажыццяўляецца ў межах патрабаванняў дзяржаўнага адукацыйнага стандарту агульнай сярэдняй адукацыі, вызначаюцца вучэбнымі планамі і вучэбнымі праграмамі, якія зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

51. Ва Установе па жаданні законных прадстаўнікоў вучняў можа адкрывацца група падоўжанага дня для вучняў.

52. У адпаведнасці з патрабаваннямі санітарных правілаў і нормаў у групах падоўжанага дня арганізуецца двухразовае (трохразовае) харчаванне вучняў за кошт сродкаў іх законных прадстаўнікоў. Для харчавання вучняў могуць выкарыстоўвацца прадукты з прышкольнага ўчастка і шэфскай гаспадаркі, сродкі, якія выдзяляюць Установе арганізацыі і фізічныя асобы.

53. Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы могуць вызваляць вучняў з малазабяспечаных сямей ад платы за харчаванне ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

54. Харчаванне дзяцей дашкольнага ўзросту арганізуецца ў адпаведнасці з нормамі харчавання дзяцей ва Установе, зацверджанымі Пастановамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, Міністэрства гандлю Рэспублікі Беларусь.

Харчаванне дзяцей 6 гадоў і больш позняга ўзросту арганізуецца ў адпаведнасці з нормамі для дзяцей дадзенай узроставай катэгорыі, устаноўленымі заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

55. Абавязковае медыцынскае абслугоўванне вучняў ва Установе забяспечваецца дзяржаўнымі арганізацыямі аховы здароўя.

## ГЛАВА 3
## МОВЫ НАВУЧАННЯ І ВЫХАВАННЯ

56. У адпаведнасці з асноўнымі напрамкамі дзяржаўнай палітыкі ў сферы адукацыі ва Установе забяспечваецца роўнасць беларускай і рускай моў.

57. Вывучэнне рускай, беларускай і адной з замежных моў ва Установе, за выключэннем асобных катэгорый асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, з'яўляецца абавязковым.

Катэгорыі асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і парадак вывучэння імі моў вызначаюцца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Парадак вывучэння беларускай і рускай моў замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства, якія часова знаходзяцца і часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, вызначаецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

58. Навучанне ва Установе ажыццяўляецца на беларускай мове. Выхаванне ва Установе ажыццяўляецца на беларускай і рускай мовах.

59. Абавязковай для вывучэння замежнай мовай з'яўляецца нямецкая мова.

Ва Установе забяспечваецца працяг вывучэння навучэнцамі IV-XI класаў раней вывучаемай замежнай мовы, якая не вывучаецца ў дадзенай Установе, у парадку, вызначаным Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі.

## ГЛАВА 4
## КРЫНІЦЫ І ПАРАДАК ФАРМІРАВАННЯ МАЁМАСЦІ УСТАНОВЫ

60. Маёмасць Установы фарміруецца за кошт наступных крыніц:

сродкі, якія прадстаўляюцца Заснавальнікам у парадку фінансавання дзейнасці Установы;

сродкі, атрыманыя ад дзейнасці, якая прыносіць даходы;

бязвыплатная (спонсарская) дапамога;

замежная бязвыплатная дапамога;

добраахвотныя peралічэння (узносы) фізічных асоб;

іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам.

61. Маёмасць, якая перададзена Установе, знаходзіцца ў камунальнай уласнасці Дзяржынскага раёна і замацавана за ім на праве аператыўнага кіравання.

62. Маёмасць Установы складаюць асноўныя фонды, абаротныя сродкі, а таксама іншыя матэрыяльныя каштоўнасці, кошт якіх адлюстроўваецца ў самастойным балансе.

63. Установа ў адносінах да замацаванай маёмасці ажыццяўляе права валодання, карыстання і распараджэння ў межах і на ўмовах, устаноўленых уласнікам або ўпаўнаважаным органам, у адпаведнасці з мэтамі сваёй дзейнасці, заданнямі ўласніка і прызначэннем маёмасці.

64. Установа не мае права без згоды Заснавальніка адчужаць, здаваць у арэнду, заклад ці іншым спосабам распараджацца замацаванай за ім маёмасцю і маёмасцю набытай, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі.

65. Матэрыяльна-тэхнічная база Установы фарміруецца Заснавальнікам па дзеючым нарматывам у адпаведнасці з патрабаваннямі, усталяванымі заканадаўствам.

Матэрыяльна-тэхнічную базу Установы складаюць зямельны ўчастак, будынак, збудаванні, абсталяванне, транспартныя сродкі і іншая маёмасць.

66. Установа, Упраўленне забяспечваюць абнаўленне і развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы Установы.

67. Установа нясе адказнасць за захаванне і эфектыўнае выкарыстанне замацаванай за ёй маёмасці, арганізацыю эксплуатацыі матэрыяльна-тэхнічнай базы ў адпаведнасці з нарматыўнымі патрабаваннямі.

68. Забараняюцца дзеянні (бяздзейнасць), якія прыводзяць да неабгрунтаванага скарачэння ці пагаршэння матэрыяльна-тэхнічнай базы Установы.

69. Заснавальнік, Упраўленне маюць права канфіскаваць лішнюю маёмасць, якая не выкарыстоўваецца, альбо якая выкарыстоўваецца не па прызначэнні і распарадзіцца ёй па сваім меркаванні ў рамках дзеючага заканадаўства.

70. Кіраўнік Установы па ўзгадненні з Упраўленнем мае права арандаваць маёмасць іншых арганізацый для рэалізацыі мэтаў Установы.

71. Сродкі, атрыманыя Установай ад дзейнасці, якая прыносіць даходы, і набытая за кошт іх маёмасць паступаюць у яго самастойнае распараджэнне і расходуюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

72. Выдаткі Установы па ажыццяўленні дзейнасці, якая прыносіць даходы, фінансуюцца за кошт пазабюджэтных сродкаў у парадку, прадугледжаным заканадаўствам.

73. Пазабюджэтныя сродкі ў частцы сумы перавышэння даходаў над выдаткамі, якая застаецца ў распараджэнні ўстановы, выкарыстоўваецца для:

развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы;

ажыццяўлення інавацыйнай дзейнасці;

ажыццяўлення дадатковых выплат стымулюючага характару, аказання матэрыяльнай дапамогі работнікам установы, якія навучаюцца пры ўмове адсутнасці пратэрмінаванай крэдыторскай запазычанасці ўстановы (без уліку бюджэтных абавязацельстваў, зарэгістраваных ва ўстаноўленым парадку тэрытарыяльнымі органамі дзяржаўнага казначэйства) па плацяжах у бюджэт, дзяржаўныя пазабюджэтныя фонды, аплаце за тавары (работы, паслугі);

іншых мэтаў у адпаведнасці з заканадаўствам.

Сума перавышэння даходаў над выдаткамі, якая застаецца ў распараджэнні Установы, - розніца паміж даходамі ад прыносіць даходы па кожнай крыніцы даходаў, паменшанымі на сумы падаткаў, збораў (пошлін) і іншых абавязковых плацяжоў, выплачаных у рэспубліканскі і мясцовыя бюджэты, дзяржаўныя пазабюджэтныя фонды, і фактычнымі выдаткамі па кожнай крыніцы даходаў у межах каштарысу.

74. Падставай для ажыццяўлення расходаў пазабюджэтных сродкаў з'яўляюцца каштарыс, што складаецца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам.

75. Не выкарыстаныя ў справаздачным фінансавым годзе пазабюджэтныя сродкі не падлягаюць пералічэнню ў бюджэт і выкарыстоўваюцца ў чарговым фінансавым годзе ў парадку, устаноўленым заканадаўствам.

76. Бязвыплатная (спонсарская) дапамога, прадстаўленая Установе, у тым ліку грашовыя сродкі, выкарыстоўваецца ў мэтах:

стварэння і ўмацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы;

выпуску вучэбных выданняў і сродкаў навучання, арганізацыі харчавання навучэнцаў установы.

Канкрэтная мэта выкарыстання бязвыплатнай (спонсарскай) дапамогі вызначаецца дагаворам на аказанне бязвыплатнай (спонсарскай) дапамогі.

Грашовыя сродкі, атрыманыя Установай у якасці бязвыплатнай (спонсарскай) дапамогі ад юрыдычных, фізічных асоб або індывідуальных прадпрымальнікаў, выдаткоўваюцца выключна

на набыццё відаў тавараў (работ, паслуг), прадугледжаных дагаворам аказання бязвыплатнай (спонсарскай) дапамогі.

77. Замежная бязвыплатная дапамога, атрыманая Установай, падлягае рэгістрацыі ў Дэпартаменце па гуманітарнай дзейнасці Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (далей - Дэпартамент па гуманітарнай дзейнасці) ва ўстаноўленым парадку. Выключэнне складаюць выпадкі, прадугледжаныя заканадаўствам.

Замежная бязвыплатная дапамога, прадастаўленая Установе, у тым ліку грашовыя сродкі, выкарыстоўваецца ў мэтах:

правядзення навучання;

ўмацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы Установы, будаўніцтва, рамонту (рэканструкцыі) аб'ектаў сацыяльнага прызначэння;

развіцця фізічнай культуры і спорту, дзіцяча-юнацкага спорту, у тым ліку правядзення фізкультурна-аздараўленчай і спартыўна-масавай работы.

Замежная бязвыплатная дапамога, прадастаўленая Установе, у тым ліку грашовыя сродкі, выкарыстоўваецца ў мэтах, вызначаных дагаворам, даравальным лістом ці іншым дакументам, які вызначае ўмовы аказання замежнай бязвыплатнай дапамогі.

На падставе названых дакументаў Установа складае і ўзгадняе ва ўстаноўленым парадку з Дэпартаментам па гуманітарнай дзейнасці план мэтавага выкарыстання (размеркавання) замежнай бязвыплатнай дапамогі, у якім адлюстроўваюцца мэты выкарыстання дапамогі, пералік арганізацый і (або) фізічных асоб (іх катэгорый), якія ажыццяўляюць рэалізацыю гэтых мэтаў.

Установа мае права звярнуцца ў Дэпартамент па гуманітарнай дзейнасці па ўзгадненне новай мэты выкарыстання замежнай бязвыплатнай дапамогі ў выпадках і парадку, прадугледжаных заканадаўствам.

78. Грашовыя сродкі, што паступілі на бягучы (разліковы) рахунак Установы ў якасці добраахвотных пералічэнняў (узносаў) фізічных, юрыдычных асоб, накіраваныя ў распараджэнне апякунскага савета, выкарыстоўваюцца ў мэтах, якія вызначаюцца рашэннем апякунскага савета, узгодненым з дырэктарам і бацькоўскім камітэтам Установы (пры яго наяўнасці), у тым ліку на:

умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы;

правядзенне спартыўна-масавых, фізкультурна-аздараўленчых, сацыяльна-культурных, адукацыйных мерапрыемстваў;

іншыя мэты, не забароненыя заканадаўствам.

79. Установа можа ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць па аказанні платных дадатковых адукацыйных паслуг, якія не фінансуюцца з рэспубліканскага або мясцовага бюджэту.

80. Аказанне платных дадатковых адукацыйных паслуг не можа ажыццяўляцца ў замен або ў рамках адукацыйнай дзейнасці, фінансуемых за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў.

81 Аказанне Установай платных адукацыйных паслуг навучэнцам ажыццяўляецца дабравольна і са згоды законных прадстаўнікоў навучэнцаў на падставе дагавора.

## ГЛАВА 5
## ПАРАДАК КІРАВАННЯ ДЗЕЙНАСЦЮ УСТАНОВЫ. СТРУКТУРА І ПАРАДАК ФАРМІРАВАННЯ ОРГАНАЎ КІРАВАННЯ І САМАКІРАВАННЯ

82.Упраўленне дзейнасцю Установы ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь, у тым ліку сапраўдным Статутам і грунтуецца на спалучэнні прынцыпаў адзінаначалля і самакіравання.

83. Непасрэднае кіраўніцтва Установай ажыццяўляе дырэктар, які прызначаецца на пасаду і вызваляецца ад пасады начальнікам упраўлення па адукацыі, спорце і турызме Дзяржынскага раённага выканаўчага камітэта па ўзгадненні з Дзяржынскім раённым выканаўчым камітэтам і галоўным упраўленнем па адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта.

З дырэктарам заключаецца кантракт у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

84. Дырэктар Установы:

узначальвае Установу, кіруе яе работай, забяспечвае ўзаемадзеянне з зацікаўленымі;

нясе адказнасць за вынікі работы Установы ў адпаведнасці з заканадаўствам;

дзейнічае ад імя Установы без даверанасці, прадстаўляе яе ва ўсіх арганізацыях;

у рамках сваёй кампетэнцыі выдае загады і дае распараджэнні, выкананне якіх абавязкова для ўсіх работнікаў і навучэнцаў;

ажыццяўляе прыём і звальненне педагагічных і іншых работнікаў Установы, зацвярджае іх службовыя інструкцыі, заключае (падаўжае, скасоўвае) з імі працоўныя дагаворы (кантракты), прымяняе да іх меры заахвочвання, дысцыплінарнай адказнасці;

зацвярджае структуру і штатны расклад Установы згодна тыпавых штатаў і зацверджаным нарматывам колькасці работнікаў у межах сродкаў, якія вылучаюцца на аплату працы;

арганізуе работу Установы па разглядзе зваротаў грамадзян і юрыдычных асоб, вядзенні кнігі заўваг і прапаноў, ажыццяўленні адміністрацыйных працэдур. Пры неабходнасці ўносіць прапановы па зваротах на разгляд Заснавальніка;

ажыццяўляе асабісты прыём грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб;

ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы, прадугледжаныя Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, іншымі актамі заканадаўства, статутам установы адукацыі.

85. Асноўным органам самакіравання з'яўляецца педагагічны савет Установы, старшынёй якога з'яўляецца дырэктар. Кампетэнцыя, склад і арганізацыя дзейнасці педагагічнага савета вызначаюцца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

86. Педагагічны савет з'яўляецца калегіяльным органам, які разглядае пытанні арганізацыі адукацыйнага працэсу, вызначае шляхі рэалізацыі зместу адукацыі, правядзення атэстацыі і выпуску вучняў, павышэння якасці адукацыі, прафесійнага ўзроўню педагагічных работнікаў і іншыя пытанні адукацыйнай дзейнасці Установы.

87. Склад педагагічнага савета зацвярджаецца дырэктарам тэрмінам на адзін навучальны год. У яго ўключаюцца педагагічныя работнікі Установы.

88. Непасрэднае кіраўніцтва дзейнасцю педагагічнага савета ажыццяўляе старшыня педагагічнага савета, а ў выпадку яго адсутнасці - упаўнаважаная дырэктарам асоба.

89. Паўнамоцтвы старшыні педагагічнага савета:

арганізацыя дзейнасці педагагічнага савета;

прызначэнне часу і месца пасяджэння педагагічнага савета;

правядзенне пасяджэння педагагічнага савета;

зацвярджэнне рэгламенту выступленняў;

арганізацыя працы членаў педагагічнага савета па падрыхтоўцы матэрыялаў да педагагічнага савета і азнаямленню з імі;

ажыццяўленне сістэматычнага кантролю за выкананнем прынятых рашэнняў, аналіз іх выканання, вынясенне вынікаў на чарговае пасяджэнне.

90. Педагагічны савет выбірае са свайго складу сакратара педагагічнага савета тэрмінам на адзін год.

Паўнамоцтвы сакратара педагагічнага савета:

забеспячэнне падрыхтоўкі пасяджэнняў педагагічнага савета і арганізацыйна-тэхнічнае суправаджэнне яго дзейнасці;

арганізацыя метадычнай работы па падрыхтоўцы матэрыялаў да пасяджэння педагагічнага савета;

інфармаванне членаў педагагічнага савета і запрошаных асоб аб часе і месцы паседжанняў педагагічнага савета, парадку дня;

вядзенне пратаколаў пасяджэнняў педагагічнага савета;

забеспячэнне азнаямлення ўсіх членаў педагагічнага савета з матэрыяламі пасяджэнняў педагагічнага савета, пратаколам.

91. Члены педагагічнага савета маюць права:

уносіць на разгляд педагагічнага савета пытанні, якія адносяцца да кампетэнцыі педагагічнага савета, у тым ліку прапановы па ўдасканаленні і развіцці адукацыйнага працэсу ва Установе;

удзельнічаць у абмеркаванні ўсіх пытанняў, якія разглядаюцца на педагагічным савеце, уносіць прапановы па іх.

92. Члены педагагічнага савета абавязаны:

наведваць паседжанні педагагічнага савета, прымаць актыўны ўдзел у яго працы і выконваць прынятыя рашэнні;

забяспечваць своечасовую падрыхтоўку матэрыялаў да чарговага пасяджэння педагагічнага савета;

знаёміцца з пратаколам шляхам прастаўлення адпаведных адзнак (подпісы і даты азнаямлення) у выпадку адсутнасці на пасяджэнні педсавета.

93. Педагагічны савет ажыццяўляе сваю работу ў форме пасяджэнняў, якія праводзяцца па плане, які зацвярджаецца дырэктарам не пазней 1 верасня бягучага года на навучальны год пасля разгляду на пасяджэнні педагагічнага савета. Змест плана работы вызначаецца актуальнымі задачамі, якія стаяць перад Установай. Пасяджэнні педагагічнага савета праводзяцца не радзей за адзін раз на чвэрць у адпаведнасці з планам работы або па меры неабходнасці для вырашэння пытанняў, якія адносяцца да кампетэнцыі педагагічнага савета.

На пасяджэнне педагагічнага савета могуць запрашацца прадстаўнікі дзяржаўных і грамадскіх арганізацый, педагагічныя работнікі іншых устаноў адукацыі і іншыя зацікаўленыя асобы.

94. Па пытаннях, што абмяркоўваюцца на пасяджэннях педагагічнага савета, прымаюцца рашэнні з указаннем тэрмінаў выканання і асоб, адказных за выкананне. Рашэнні педагагічнага савета прымаюцца простай большасцю галасоў пры наяўнасці на пасяджэнні педагагічнага савета не менш як дзве трэці яго спісачнага складу. Пры роўнай колькасці галасоў вырашальным з'яўляецца голас старшыні. Рашэнні педагагічнага савета пасля зацвярджэння іх загадам дырэктара з'яўляюцца абавязковымі для выканання

ўсімі педагагічнымі работнікамі і навучэнцамі Установы, іх законнымі прадстаўнікамі.

95. Пасяджэнні педагагічнага савета афармляюцца сакратаром педагагічнага савета пратаколам на працягу пяці дзён пасля яго правядзення.

96. Ва Установе могуць ствараецца іншыя органы самакіравання (апякунскі савет, бацькоўскі камітэт).

97. Апякунскі савет ствараецца ў мэтах аказання садзейнічання ў забеспячэнні дзейнасці і развіцця Установы.

98. Рашэнне аб стварэнні апякунскага савета прымаецца ініцыятыўнай групай, у склад якой могуць уваходзіць законныя прадстаўнікі навучэнцаў, педагагічныя работнікі, прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў і іншых арганізацый, іншыя асобы. Рашэнне ініцыятыўнай групы ўзгадняецца з дырэктарам.

99. Апякунскі савет арганізуе сваю работу ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, Палажэннем аб апякунскім савеце ўстановы адукацыі, іншымі актамі заканадаўства, сапраўдным Статутам.

Апякунскі савет распрацоўвае, прымае і арганізуе рэалізацыю планаў сваёй дзейнасці ў інтарэсах Установы.

100. Апякунскі савет узаемадзейнічае з дырэктарам і іншымі органамі самакіравання Установы па пытаннях функцыянавання і развіцця Установы. Прадстаўнік апякунскага савета можа ўдзельнічаць у рабоце іншых органаў самакіравання.

101. Рашэнні апякунскага савета носяць кансультатыўны і рэкамендацыйны характар.

102. Выкананне членамі апякунскага савета сваіх функцый ажыццяўляецца выключна на бязвыплатнай аснове.

103. Дзейнасць апякунскага савета можа быць спынена па ініцыятыве і (або) рашэнню агульнага сходу апякунскага савета. У выпадку парушэння апякунскім саветам патрабаванняў заканадаўства яго дзейнасць можа быць спынена па ініцыятыве дырэктара.

104. Задачамі дзейнасці апякунскага савета з'яўляюцца:

садзейнічанне Установе ў развіцці матэрыяльна-тэхнічнай базы, забеспячэнні якасці адукацыі, прыцягненні грашовых сродкаў для забеспячэння дзейнасці Установы;

распрацоўка і рэалізацыя планаў сваёй дзейнасці ў інтарэсах Установы;

садзейнічанне ў паляпшэнні ўмоў працы педагагічных і іншых работнікаў Установы;

вызначэнне напрамкаў, памераў і парадку выкарыстання сродкаў апякунскага савета па ўзгадненні з дырэктарам і бацькоўскім камітэтам Установы (пры яго наяўнасці);

садзейнічанне ва ўсталяванні і развіцці міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы адукацыі;

мэтавае выкарыстанне сродкаў апякунскага савета.

105. У склад апякунскага савета могуць уваходзіць законныя прадстаўнікі навучэнцаў, педагагічныя работнікі, прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў і іншых арганізацый, іншыя асобы.

106. Рашэнне аб уключэнні ў склад апякунскага савета прымаецца агульным сходам апякунскага савета.

107. Член апякунскага савета мае права:

уносіць прапановы па ўсіх напрамках дзейнасці апякунскага савета на сходах апякунскага савета; атрымліваць інфармацыю, наяўную ў распараджэнні апякунскага савета;

удзельнічаць ва ўсіх мерапрыемствах, якія праводзяцца апякунскім саветам.

108. Член апякунскага савета абавязаны:

выконваць патрабаванні заканадаўства Рэспублікі Беларусь і сапраўднага Статута;

прымаць актыўны ўдзел у дзейнасці апякунскага савета;

выконваць рашэнні апякунскага савета.

109. Вышэйшым органам кіравання апякунскім саветам з'яўляецца агульны сход. Узначальвае агульны сход апякунскага савета старшыня апякунскага савета, які выбіраецца на 3 гады.

110. Установа забяспечвае ўмовы для дзейнасці апякунскага савета, у тым ліку шляхам прадастаўлення месца для захоўвання дакументацыі апякунскага савета.

111. Агульны сход мае права прымаць рашэнні, калі ў ім удзельнічаюць больш за палову членаў апякунскага савета. Рашэнні прымаюцца простай большасцю прысутных членаў апякунскага савета. Рашэнні па пытаннях, якія адносяцца да выключнай кампетэнцыі агульнага сходу, прымаюцца кваліфікаванай большасцю (не менш як дзве трэці) галасоў прысутных членаў папячыцельскага савета. Рашэнні агульнага сходу апякунскага савета даводзяцца да ведама ўсіх зацікаўленых асоб.

112. Бацькоўскі камітэт ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, Палажэннем аб бацькоўскім камітэце ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі, іншымі актамі заканадаўства, сапраўдным Статутам.

113. Да кампетэнцыі бацькоўскага камітэта адносяцца:

садзейнічанне забеспячэнню аптымальных умоў для арганізацыі адукацыйнага працэсу;

правядзенне растлумачальнай і кансультатыўнай работы сярод бацькоў навучэнцаў аб іх правах і абавязках;

распаўсюджванне лепшага вопыту сямейнага выхавання;

аказанне садзейнічання ў правядзенні фізкультурна-аздараўленчых, культурна-масавых і іншых мерапрыемстваў;

узаемадзеянне з грамадскімі арганізацыямі ў пытанні прапаганды традыцый установы адукацыі;

узаемадзеянне з педагагічным калектывам установы адукацыі па пытаннях прафілактыкі правапарушэнняў сярод непаўналетніх навучэнцаў;

узаемадзеянне з іншымі органамі самакіравання Установы па пытаннях, якія адносяцца да кампетэнцыі бацькоўскага камітэта;

іншыя пытанні, за выключэннем пытанняў, якія тычацца прыцягнення грашовых сродкаў для забеспячэння дзейнасці Установы.

114. Бацькоўскі камітэт складаецца з законных прадстаўнікоў навучэнцаў. Структура і парадак фарміравання бацькоўскага камітэта вызначаецца ў адпаведнасці з Палажэннем аб бацькоўскім камітэце ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі.

115. Склад бацькоўскага камітэта вызначаецца на агульным бацькоўскім сходзе Установы з прадстаўнікоў бацькоў (па адным ад кожнага класа) тэрмінам на адзін год.

116. Рашэнні бацькоўскага камітэта носяць рэкамендацыйны характар.

117. Для каардынацыі дзейнасці ў рабоце бацькоўскага камітэта можа прымаць удзел намеснік кіраўніка Установы.

118. З свайго складу бацькоўскі камітэт на першым пасяджэнні выбірае старшыню. У залежнасці ад колькаснага складу бацькоўскага камітэта могуць выбірацца намеснікі старшыні, сакратар.

119. Органы самакіравання Установы ствараюцца і ажыццяўляюць сваю дзейнасць у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і статутам Установы.

120. Палажэнні аб органах самакіравання зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

121. У мэтах забеспячэння правоў навучэнцаў ва Упраўленні Установай могуць стварацца і дзейнічаць органы вучнёўскага самакіравання.

Установа прызнае прадстаўнікоў органаў вучнёўскага самакіравання, прадастаўляе ім неабходную інфармацыю.

122. Прафесійныя саюзы, якія дзейнічаюць ва Установе, удзельнічаюць у кіраванні Установай у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, лакальнымі актамі Установы.

## ГЛАВА 6
## ПАРАДАК КАНТРОЛЮ ЗА ДЗЕЙНАСЦЮ УСТАНОВЫ

123. Кантроль за дзейнасцю Установы ажыццяўляе Упраўленне і іншыя ўпаўнаважаныя дзяржаўныя органы ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Рэвізія (праверка) фінансава-гаспадарчай дзейнасці Установы праводзіцца дзяржаўнымі кантралюючымі органамі, упаўнаважанымі ў адпаведнасці з актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь ажыццяўляць рэвізіі (праверкі) фінансава-гаспадарчай дзейнасці юрыдычных асоб.

Дзяржаўныя органы, упаўнаважаныя ажыццяўляць кантроль за забеспячэннем якасці адукацыі, ажыццяўляюць дзейнасць па праверцы адпаведнасці адукацыі адукацыйнаму стандарту, вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм, адукацыйнай дзейнасці патрабаванням заканадаўства.

124. Установа ажыццяўляе самакантроль за забеспячэннем якасці адукацыі (комплексны аналіз адукацыйнай дзейнасці, які ўключае самаправерку, самаацэнку адукацыйнай дзейнасці).

Парадак і перыядычнасць правядзення самакантролю за забеспячэннем якасці адукацыі вызначаецца дырэктарам Установы.

## ГЛАВА 7
## ПАРАДАК ФАРМІРАВАННЯ СТРУКТУРЫ І ШТАТНЫ РАСКЛАД УСТАНОВЫ

125. Структура і штатны расклад Установы зацвярджаюцца дырэктарам па ўзгадненні з Упраўленнем і Заснавальнікам на падставе тыпавых штатаў і зацверджанымі нарматывамі колькасці работнікаў, у межах сродкаў, выдзеленых на аплату працы, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам.

126. Да структурных падраздзяленнях Установы адносяцца бібліятэка, вучэбна-вопытны ўчастак, пункт карэкцыйна-педагагічнай дапамогі, вучэбная (вучэбна-вытворчая) майстэрня, сталовая, дзіцячы сад.

Могуць ствaрацца іншыя структурныя падраздзяленні: рэсурсны цэнтр, лагер, бухгалтэрыя, сацыяльна-педагагічная і псіхалагічная служба, іншыя структурныя падраздзяленні.

Структурныя падраздзяленні ствараюцца і ажыццяўляюць сваю дзейнасць у адпаведнасці з заканадаўствам, дадзеным Статутам, палажэннем.

Палажэнне аб адпаведным структурным падраздзяленні зацвярджаецца дырэктарам Установы, калі іншае не зацверджана іншымі заканадаўчымі актамі.

127. Прыём на працу ва Установу педагагічных і іншых работнікаў, за выключэннем намеснікаў дырэктара па вучэбнай, вучэбна-метадычнай, вучэбна-выхаваўчай і выхаваўчай рабоце, асноўнай дзейнасці, ажыццяўляе дырэктар.

Дырэктар Установы ажыццяўляе прыём на працу педагагічных работнікаў па ўзгадненні з Упраўленнем па адукацыі, спорце і турызме Дзяржынскага райвыканкама.

Начальнік Упраўлення ажыццяўляе прыём на працу намеснікаў дырэктара па вучэбнай, вучэбна-метадычнай, вучэбна-выхаваўчай і выхаваўчай рабоце, асноўнай дзейнасці.

128. На педагагічную работу прымаюцца асобы, якія маюць вышэйшую або сярэднюю спецыяльную адукацыю. Пры неабходнасці на педагагічную работу могуць быць прыняты асобы, якія маюць вышэйшую або сярэднюю спецыяльную непедагагічную адукацыю з умовай праходжання курсаў перападрыхтоўкі па вызначаным педагагічным профілі. Спецыяльнасць педагагічнага профілю і праходжанне перападрыхтоўкі павінна пацвярджацца адпаведнымі дакументамі.

129. Да іншых работнікаў Установы адносяцца асобы, якія ажыццяўляюць адміністратыўна-гаспадарчыя функцыі, функцыі абслугоўвання і іншыя дапаможныя функцыі.

130. Працоўныя адносіны, правы і абавязкі педагагічных і іншых работнікаў Установы вызначаюцца і рэгулююцца Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15 снежня 2014 г. № 5 «Аб узмацненні патрабаванняў да кіруючых кадраў і работнікаў арганізацый», Працоўным кодэксам Рэспублікі Беларусь, калектыўным дагаворам, працоўным дагаворам (кантрактам), сапраўдным Статутам, Правіламі ўнутранага працоўнага распарадку, службовымі (працоўнымі) інструкцыямі работнікаў Установы, іншымі нарматыўнымі прававымі актамі.

Службовыя (рабочыя) інструкцыі работнікаў распрацоўваюцца і зацвярджаюцца дырэктарам Установы на аснове тыпавых кваліфікацыйных характарыстык і ўзгадняюцца з прафсаюзным камітэтам.

131. Асноўныя патрабаванні, што прад'яўляюцца да педагагічных работнікаў, вызначаюцца кваліфікацыйнымі характарыстыкамі, зацверджанымі ў парадку, устаноўленым заканадаўствам.

132. Педагагічную дзейнасць не могуць ажыццяўляць асобы:

пазбаўленыя права займацца педагагічнай дзейнасцю;

якія маюць судзімасць;

прызнаныя недзеяздольнымі або абмежавана дзеяздольнымі;

якія не маюць права займацца педагагічнай дзейнасцю ў выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі.

Пры ўзнікненні ў перыяд ажыццяўлення педагагічнай дзейнасці абставін, якія перашкаджаюць яе ажыццяўленню і прадугледжаных часткай першай гэтага пункта, ажыццяўленне педагагічнай дзейнасці спыняецца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

133. Педагагічныя, іншыя работнікі Установы маюць права на абарону прафесійнага і асабістага гонару і годнасці.

134. Аплата працы работнікаў Установы ажыццяўляецца ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам, дзеючымі ва Установе палажэннямі аб прэміраванні, надбаўках і даплатах.

135. Атэстацыя педагагічных работнікаў Установы ажыццяўляецца ў парадку, вызначаным Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 8
## КАМПЕТЭНЦЫІ ЗАСНАВАЛЬНІКАЎ

136. Да выключнай кампетэнцыі Заснавальніка адносіцца прыняцце рашэнняў па наступных пытаннях:

стварэнне Установы, зацвярджэнне яго Статута, ўнясенне змяненняў і (або) дапаўненняў у Статут;

рэарганізацыя і ліквідацыя Установы;

стварэнне і спыненне дзейнасці адасобленых падраздзяленняў;

выдача згоды Установе на распараджэнне замацаваным за ёй маёмасцю і маёмасцю, набытай за кошт выдзеленых ёй Заснавальнікам сродкаў;

прыняцце мер па пераводу навучэнцаў у іншыя ўстановы адукацыі ў выпадку спынення дзейнасці Установы, анулявання, спынення дзеяння спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) на адукацыйную дзейнасць Установы (па яго адасобленых падраздзяленнях, у адносінах да адной або некалькіх работ і (або) паслуг, якія складаюць адукацыйную дзейнасць);

прыняцце рашэння аб змене віду Установы;

іншыя пытанні ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і сапраўдным Статутам.

137. Да кампетэнцыі Упраўлення адносіцца:

прызначэнне (вызваленне) кіраўніка Установы, яго намеснікаў па асноўнай дзейнасці, вучэбнай, вучэбна-выхаваўчай (вучэбна-метадычнай), выхаваўчай рабоце; заключэнне, змяненне і спыненне з імі працоўных дагавораў (кантрактаў), матэрыяльнае стымуляванне іх работы;

ажыццяўленне кантролю за забеспячэннем якасці адукацыі і дзейнасцю Установы, выкарыстаннем і захаванасцю яе маёмасці, выкананнем Установай заканадаўства Рэспублікі Беларусь у галіне адукацыі;

узгадненне прызначэння (вызвалення) педагагічных кадраў Установы;

арганізацыя павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі педагагічных кадраў Установы;

устанаўленне броні для прадастаўлення працоўных месцаў ва Установе ў адпаведнасці з рашэннямі Дзяржынскага раённага выканаўчага камітэта;

узгадненне плана работы Установы на навучальны год, вучэбных планаў Установы;

забеспячэнне Установы фінансавымі сродкамі ў межах выдзеленых фінансавых сродкаў раённым бюджэтам;

забеспячэнне Установы падручнікамі, вучэбна-плануючай і вучэбна-праграмнай дакументацыяй, вучэбна-метадычнай і мастацкай літаратурай, бланкамі дакументаў аб адукацыі;

адмена загадаў, рашэнняў Установы, якія супярэчаць дзеючаму заканадаўству;

прыняцце рашэння аб атрыманні навучэнцамі агульнай сярэдняй адукацыі дома;

прыняцце рашэння аб вызваленні навучэнцаў ад выпускных экзаменаў, узнагароджанні выпускнікоў сярэдняй школы залатым (сярэбраным) медалём.

фарміраванне, абнаўленне, развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы Установы;

правядзенне не радзей 1 разу ў 5 гадоў комплекснага вывучэння дзейнасці Установы па забеспячэнні якасці адукацыі, правядзенне вывучэння дзейнасці Установы па асобных пытаннях у адпаведнасці з гадавым планам работы Дзяржынскага раённага выканаўчага камітэта, Упраўлення;

ажыццяўленне іншых правоў і абавязкаў, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, Палажэннем аб упраўленні

па адукацыі, спорце і турызме Дзяржынскага раённага выканаўчага камітэта, сапраўдным Статутам.

138. Упраўленне аказвае садзейнічанне Установе ў ажыццяўленні статутнай дзейнасці, выкананні работ на аб'ектах капітальнага будаўніцтва і рамонту Установы, захаванні правіл і нормаў аховы працы, пажарнай бяспекі, укараненні энергазберагальных тэхналогій, матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні, рамонце і эксплуатацыі аўтобуса для арганізацыі падвозу навучэнцаў, арганізацыі завозу прадуктаў для арганізацыі харчавання навучэнцаў; рамонце і эксплуатацыі камп’ютарнай тэхнікі; выкарыстанні магчымасцяў Дзяржынскай рэгіянальнай адукацыйнай сеткі.

139. Упраўленне арганізуе ўзаемадзеянне Установы і арганізацый Дзяржынскага раённага выканаўчага камітэта, ажыццяўляе каардынацыю вытворчага, матэрыяльна-тэхнічнага і гаспадарчага забеспячэння Установы ў інтарэсах стварэння належных умоў для забеспячэння адукацыйнага працэсу ва Установе.

140. Фінансава-гаспадарчая дзейнасць Установы ажыццяўляецца дзяржаўнай установай “Цэнтр па забеспячэнні дзейнасці бюджэтных арганізацый Дзяржынскага раёна” на дагаворнай аснове.

## ГЛАВА 9
## ПАРАДАК АРГАНІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНАГА І ВЫХАВАЎЧАГА ПРАЦЭСАЎ

141. Адукацыйны працэс арганізуецца на аснове:

прынцыпаў дзяржаўнай палітыкі ў сферы адукацыі;

адукацыйных стандартаў;

дасягненняў у галіне навукі і тэхнікі, што рэалізуюцца ў галінах эканомікі і сацыяльнай сферы, інавацыйных праектаў;

педагагічна абгрунтаванага выбару формаў, метадаў і сродкаў навучання і выхавання;

культурных традыцый і каштоўнасцей беларускага народа, дасягненняў сусветнай культуры;

сучасных адукацыйных і інфармацыйных тэхналогій.

142. Арганізацыя адукацыйнага працэсу ажыццяўляецца ў адпаведнасці с патрабаваннямі Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі, вучэбна-праграмнай дакументацыяй адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі і іншых нарматыўных прававых актаў, якія рэгламентуюць дзейнасць устаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

143. Асноўныя патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу:

забеспячэнне якасці адукацыі;

кампетэнтнасны падыход;

ахова здароўя навучэнцаў;

выкананне ўстаноўленай працягласці навучальнага года і канікул, тэрмінаў і форм атэстацыі навучэнцаў;

саблюдзенне санітарных нормаў, правілаў і гігіенічных нарматываў;

стварэнне бяспечных умоў пры арганізацыі адукацыйнага працэсу. Патрабаванні да мер бяспекі пры арганізацыі адукацыйнага працэсу ўстанаўліваюцца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь;

стварэнне ўмоў для развіцця творчых здольнасцяў навучэнцаў, уцягванне іх у розныя віды сацыяльна значнай дзейнасці;

забеспячэнне сацыяльна-педагагічнай падтрымкі навучэнцаў і аказання ім псіхалагічнай дапамогі;

педагагічная падтрымка дзіцячых і моладзевых грамадскіх аб'яднанняў;

стварэнне спецыяльных умоў для атрымання адукацыі асобамі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

144. Прыём ва Установу вызначаецца ў адпаведнасці з парадкам, вызначаным Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі.

145. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі ажыццяўляецца ў групах, у тым ліку ў санаторных групах, у групах інтэграванага навучання і выхавання.

146. Арганізацыя адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі ажыццяўляецца цэлы год.

147. Для арганізацыі адукацыйнага працэсу пры навучанні і выхаванні на I, II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі навучэнцы, як правіла, аднаго ўзросту аб’ядноўваюцца ў клас.

Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі можа ажыццяўляцца ў тым ліку ў класах інтэграванага навучання і выхавання, спецыялізаваных па спорце класах ці індывідуальна.

148. Навучальны год ва Установе падзяляецца на чвэрці, якія завяршаюцца прамежкавай атэстацыяй вучняў. Працягласць навучальнага года, уключаючы канікулы, устанаўліваецца з 1 верасня па 31 жніўня. Вучэбныя заняткі праводзяцца з 1 верасня па 31 мая ўключна, а для вучняў IX і XI класаў – з 1 верасня па 25 мая. Калі дадзеныя даты прыпадаюць на нерабочы дзень, то пачатак (заканчэнне) вучэбнага года (вучэбных заняткаў) пераносіцца на наступны (папярэдні) рабочы дзень. Працягласць чвэрцяў вызначаецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

149. Для навучэнцаў на працягу навучальнага года ўстанаўліваюцца восеньскія, зімовыя і вясновыя канікулы агульнай

працягласцю не менш 30 каляндарных дзён, для вучняў I і II класаў – не менш 37 каляндарных дзён. Працягласць летніх канікул павінна быць не менш 12 каляндарных тыдняў. Для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў і завяршылі навучанне і выхаванне ў IX класе на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі, працягласць летніх канікул павінна быць не менш 10 каляндарных тыдняў.

150. Арганізацыя адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі ажыццяўляецца на працягу ўсяго года з 1 верасня па 31 жніўня.

Асаблівасцю адукацыйнага працэсу ў markznaўзроставых групах з'яўляецца яго бесперапыннасць на працягу каляндарнага года. У летні перыяд пераважае аздараўленчая работа.

Рэжым работы ў групах ўстанаўліваецца Установай з улікам пажаданняў законных прадстаўнікоў. Рознаўзроставыя группы працуюць ва ўмовах пяцідзённага працоўнага тыдня з рэжымам знаходжання дзяцей 10,5 гадзін.

151. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйныя мерапрыемствы, а таксама выхаваўчая работа з вучнямі ў пазаўрочны час арганізуюцца ў рэжыме шасцідзённага тыдня, якая ўключае ў сабе пяцідзённы вучэбны тыдзень і шосты школьны дзень. Вучэбныя заняткі, а таксама факультатыўныя заняткі пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы пачатковага навучання праводзяцца ў рэжыме пяцідзённанага вучэбнага тыдня. У рэжыме шасцідзённага тыдня могуць праводзіцца факультатыўныя заняткі ў V-XI класах і рэалізоўвацца адукацыйная праграма прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых) для вучняў X-XI класаў.

152. Асноўнымі формамі арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі з'яўляюцца гульня, занятак; пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі – вучэбны занятак, занятак.

153. Вучэбныя заняткі пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі могуць праводзіцца па зменах у адпаведнасці з патрабаваннямі санітарных нормаў, правілаў і гігіенічных нарматываў.

154. Навучэнцы з улікам меркавання іх законных прадстаўнікоў, зыходзячы са схільнасцей, жаданняў і стану здароўя могуць вывучаць асобныя вучэбныя прадметы на павышаным узроўні на факультатыўных занятках у межах колькасці вучэбных гадзін на правядзенне факультатыўных заняткаў, устаноўленай тыпавым вучэбным планам установы агульнай сярэдняй адукацыі адпаведнага віду.

Факультатыўныя заняткі могуць быць прыродазнаўчай, навукова-матэматычнай, гуманітарнай, грамадазнаўчай, экалагічнай, ваенна-патрыятычнай, музычнай, харэаграфічнай, мастацкай, тэатральнай, спартыўнай і іншай накіраванасці. Факультатыўныя заняткі музычнай, харэаграфічнай і тэатральнай накіраванасці могуць праводзіцца сумесна настаўнікам, які рэалізуе змест адпаведнай вучэбнай праграмы факультатыўных заняткаў, і канцэртмайстрам (акампаніятарам).

Факультатыўныя заняткі, як правіла, праводзяцца да пачатку або пасля завяршэння ўрокаў.

155. На II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі ва Установе могуць ствараецца класы (групы) з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў на павышаным узроўні.

Пералік вучэбных прадметаў, якія могуць вывучацца на павышаным узроўні, вызначаецца кіраўніком Установы па ўзгадненні з Заснавальнікам установы ў адпаведнасці з Тыпавым вучэбным планам установы агульнай сярэдняй адукацыі адпаведнага віду.

Класы (групы) з вывучэннем асобных вучэбных прадметаў на павышаным узроўні фарміруюцца з ліку асоб, якія выказалі жаданне вывучаць на павышаным узроўні асобныя вучэбныя прадметы і маюць па завяршэнні навучання і выхавання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі па дадзеных вучэбных прадметах адзнакі не ніжэй за 7 балаў і сярэдні бал пасведчання аб агульнай базавай адукацыі не ніжэй за 7 балаў, на падставе заяў гэтых асоб (законных прадстаўнікоў непаўналетніх асоб) на імя кіраўніка Установы.

На III ступені агульнай сярэдняй адукацыі прадугледжана магчымасць правядзення факультатыўных заняткаў прафесійнай накіраванасці з мэтай арыентацыі на атрыманне педагагічных, сельскагаспадарчых (аграрных) спецыяльнасцяў, спецыяльнасцяў дзяржаўных органаў забеспячэння нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь і іншых спецыяльнасцяў.

156. На базе Установы можа ажыццяўляцца рэалізацыя адукацыйнай праграмы прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых) у рамках вучэбнага прадмета “Працоўнае навучанне” ў X (XI) классе і дапрафесійнай падрыхтоўкі вучняў VIII-IX класаў.

157. Для арганізацыі факультатыўных, стымулюючых і падтрымліваючых заняткаў навучэнцы, як правіла, аднаго або паралельных класаў аб’ядноўваюцца ў групу.

Напаўняльнасць групы для арганізацыі заняткаў, названых у частцы першай гэтага пункта, вызначана Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі.

158. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі для адораных і таленавітых вучняў, а таксама для навучэнцаў, якія па ўважлівых прычынах пастаянна або часова на працягу навучальнага года не могуць наведваць вучэбныя заняткі і праходзіць ва ўстаноўленыя тэрміны атэстацыю, можа ажыццяўляцца індывідуальна ў адпаведнасці з індывідуальным вучэбным планам.

Пры арганізацыі адукацыйнага працэсу індывідуальна ў адпаведнасці з індывідуальным вучэбным планам навучэнец можа асвойваць самастойна змест адукацыйнай праграмы, якая засвойваецца ім самастойна, праграмы агульнай сярэдняй адукацыі часткова або цалкам.

Парадак арганізацыі адукацыйнага працэсу індывідуальна ў адпаведнасці з індывідуальным вучэбным планам вызначаны Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі, зацвярджаным пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

159. Для навучэнцаў, якія па медыцынскіх паказчыках часова або пастаянна не могуць наведваць Установу, ствараюцца ўмовы для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі дома.

Пералік медыцынскіх паказанняў для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі дома вызначаецца Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

Рашэнне аб атрыманні агульнай сярэдняй адукацыі дома прымаецца Упраўленнем на падставе заявы вучня (законнага прадстаўніка непаўналетняга вучня) і заключэння ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі.

Парадак арганізацыі атрымання агульнай сярэдняй адукацыі дома вызначаецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

160. У мэтах аказання дапамогі сям’і ў навучанні і выхаванні навучэнцаў і стварэнні ўмоў для развіцця творчых здольнасцяў навучэнцаў ва Установе могуць адкрывацца групы падоўжанага дня.

Дзейнасць груп падоўжанага дня ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, Палажэннем аб групе падоўжанага дня, зацверджаным пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

161. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі арганізуецца па навучальных гадах.

Асноўнай формай арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі з’яўляецца занятак (ўрок).

Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ажыццяўляецца ў аб’яднаннях па інтарэсах або індывідуальна.

Аб'яднанне па інтарэсах ствараецца з ліку навучэнцаў на аснове агульнага інтарэсу да канкрэтнага кірунку дзейнасці. Да аб'яднанняў па інтарэсах адносяцца гурток, клуб, секцыя, студыя, майстэрня, лабараторыя, аркестр, хор, ансамбль, тэатр, навуковае таварыства навучэнцаў і іншыя аб'яднанні. Аб'яднання па інтарэсах могуць быць адна - і рознаўзроставыя. Аб'яднанні па інтарэсах могуць стварацца для работы з пераменным складам навучэнцаў.

Арганізацыя адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

162. Бягучая і выніковая атэстацыя навучэнцаў Установы праводзіцца ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі і Правіламі правядзення атэстацыі вучняў пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, зацверджанымі Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

У адпаведнасці з Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі, формы выніковай атэстацыі і парадак ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых) вызначаецца Палажэннем аб бесперапынным прафесійным навучанні па прафесіях рабочых, Правіламі правядзення атэстацыі слухачоў, стажораў пры засваенні зместу адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых, зацверджаных пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Дадатковую і прамежкавую атэстацыю вучняў ажыццяўляюць педагагічныя работнікі, майстры вытворчага навучання ўстаноў прафесійна-тэхнічнай і агульнай сярэдняй адукацыі, якія выкладаюць адпаведныя навучальныя дысцыпліны, у тым ліку і вытворчае навучанне.

163. Выхаваўчы працэс ва Установе арганізуецца ў адпаведнасці з Кодэксам аб адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Мэты, задачы, формы і метады выхаваўчай работы вызначае Праграма выхаваўчай работы Установы, якая распрацоўваецца тэрмінам на пяць гадоў на аснове адпаведнай комплекснай праграмы выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі і зацвярджаецца дырэктарам Установы.

План выхаваўчай работы Установы распрацоўваецца на бягучы навучальны год на аснове праграмы выхаваўчай работы Установы, усталёўвае мерапрыемствы па рэалізацыі асноўных напрамкаў выхавання навучэнцаў, тэрміны, месца іх правядзення, удзельнікаў,

асоб, адказных за іх правядзенне, і зацвярджаецца дырэктарам Установы.

164. Выхаванне вучняў ажыццяўляецца ў працэсе навучання, пазаўрочнай і пазашкольнай дзейнасці.

165. Арганізацыйна-выхаваўчую работу ў класе ажыццяўляюць педагагічныя работнікі, якія выконваюць функцыі класнага кіраўніка.

166. Ва Установе ў мэтах сацыяльнай адаптацыі навучэнцаў і аптымізацыі адукацыйнага працэсу ажыццяўляюцца сацыяльна-педагагічная падтрымка навучэнцаў і аказанне ім псіхалагічнай дапамогі ў адпаведнасці з нарматыўнымі актамі Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 10
## ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ СУБ’ЕКТАЎ АДУКАЦЫЙНЫХ ЗНОСІН

167. Удзельнікамі адукацыйнага працэсу з’яўляюцца навучэнцы, законныя прадстаўнікі непаўналетніх навучэнцаў, педагагічныя работнікі, Установа.

168. Установа мае права:

ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць;

фарміраваць структуру і штатны расклад Установы;

ажыццяўляць дзейнасць, якая прыносіць даходы;

удзельнічаць у навуковай, навукова-тэхнічнай, эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці, дзейнасці па навукова-метадычнаму забеспячэнню адукацыі;

ажыццяўляць праверку сапраўднасці дакумента аб адукацыі шляхам накіравання запыту ў Міністэрства адукацыі аб пацверджанні факту яго выдачы ў выпадку ўзнікнення сумненняў у сапраўднасці дакумента аб адукацыі, выдадзенага ў Рэспубліцы Беларусь, пры прыёме (залічэнні) асобы для атрымання адукацыі;

уваходзіць у склад асацыяцый (саюзаў) і іншых аб'яднанняў некамерцыйных арганізацый;

ажыццяўляць міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы адукацыі, у тым ліку знешнегандлёвую дзейнасць.

169. Установа абавязана забяспечваць:

якасць адукацыі;

распрацоўку і зацвярджэнне ва ўстаноўленым парадку структурных элементаў навукова-метадычнага забеспячэння адпаведнай адукацыі, яго ўдасканаленне;

падбор, прыём на працу і расстаноўку кадраў, павышэнне іх кваліфікацыі;

захаванне санітарна-эпідэміялагічных патрабаванняў;

стварэнне бяспечных умоў пры арганізацыі адукацыйнага і выхаваўчага працэсаў;

распрацоўку і прыняцце правілаў унутранага распарадку для навучэнцаў;

маральнае і матэрыяльнае стымуляванне навучэнцаў, педагагічных і іншых работнікаў Установы;

меры сацыяльнай абароны навучэнцаў;

стварэнне неабходных умоў для арганізацыі харчавання і аказання медыцынскай дапамогі, пражывання (пры неабходнасці) навучэнцаў;

удзел у фарміраванні кантрольных лічбаў прыёму;

азнаямленне асоб, законных прадстаўнікоў непаўналетніх асоб пры прыёме (залічэнні) ва ўстановы адукацыі з пасведчаннем аб дзяржаўнай рэгістрацыі, спецыяльным дазволам (ліцэнзіяй) на адукацыйную дзейнасць, сертыфікатамі аб дзяржаўнай акрэдытацыі, статутам, правіламі ўнутранага распарадку для навучэнцаў, правіламі ўнутранага распарадку ў інтэрнатах, іншымі лакальнымі прававымі актамі ўстаноў адукацыі, якія змяшчаюць правы і абавязкі навучэнцаў, а па іх патрабаванню – з вучэбна-праграмнай дакументацыяй;

патранат асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця на працягу двух гадоў пасля атрымання адукацыі ў гэтых установах адукацыі ў адпаведнасці з Палажэннем аб патранаце асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, зацвярджаюцца Міністэрствам адукацыі;

садзейнічанне ўпаўнаважаным дзяржаўным органам, іншым арганізацыям у правядзенні кантролю за забеспячэннем якасці адукацыі.

Іншыя абавязкі Установы ўстанаўліваюцца Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, іншымі актамі заканадаўства.

170. Навучэнцы маюць права на:

атрыманне адукацыі ў адпаведнасці з адукацыйнымі праграмамі;

перавод у іншую ўстанову адукацыі ў парадку, які ўстанаўліваецца Урадам Рэспублікі Беларусь;

навучанне і выхаванне ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам у межах зместу адукацыйнай праграмы па індывідуальным вучэбным плане, індывідуальнай вучэбнай праграме ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам;

стварэнне спецыяльных умоў для атрымання адукацыі з улікам асаблівасцяў іх псіхафізічнага развіцця;

павагу чалавечай годнасці, абарону ад усіх формаў фізічнага і псіхічнага гвалту, абразы асобы, ахову жыцця і здароўя падчас адукацыйнага працэсу;

бясплатнае псіхолага-медыка-педагагічнае абследаванне ў дзяржаўных цэнтрах карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі;

бясплатную карэкцыю парушэнняў у фізічным і (або) псіхічным развіцці ў дзяржаўных установах адукацыі, якія рэалізуюць

адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі, карэкцыйна-педагагічную дапамогу ў дзяржаўных установах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы асноўнай, дадатковай і спецыяльнай адукацыі;

карыстанне падручнікамі і навучальнымі дапаможнікамі;

канікулы;

атрыманне сацыяльна-педагагічнай падтрымкі і псіхалагічнай дапамогі з боку спецыялістаў Установы ;

заахвочванне за поспехі ў вучэбнай, грамадскай, навуковай, навукова-тэхнічнай, эксперыментальнай, інавацыйнай дзейнасці, удзел у фізкультурна-аздараўленчых, спартыўна-масавых, спартыўных мерапрыемствах, а таксама ў адукацыйных мерапрыемствах;

удзел у кіраванні Установай;

удзел у алімпіядах, конкурсах, турнірах, фестывалях, канферэнцыях, сімпозіумах, кангрэсах, семінарах, святах і іншых адукацыйных і іншых мерапрыемствах, спартыўна-масавых мерапрыемствах, грамадскай, навуковай, навукова-тэхнічнай, эксперыментальнай, інавацыйнай, культурнай дзейнасці;

азнаямленне з правіламі ўнутранага распарадку для навучэнцаў, іншымі лакальнымі прававымі актамі, якія змяшчаюць правы і абавязкі навучэнцаў, а таксама з вучэбна-праграмнай дакументацыяй;

удзел у моладзевых і іншых грамадскіх аб'яднаннях, дзейнасць якіх не супярэчыць заканадаўству.

Іншыя правы навучэнцаў усталёўваюцца ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, іншымі актамі заканадаўства, сапраўдным Статутам.

171. Навучэнцы абавязаны:

добрасумленна і адказна адносіцца да засваення зместу адукацыйных праграм, праграм выхавання;

клапаціцца пра сваё здароўе, імкнуцца да маральнага, духоўнага і фізічнага развіцця і самаўдасканалення;

выконваць патрабаванні гэтага Статута, правілаў унутранага распарадку для навучэнцаў Установы;

паважаць гонар і годнасць іншых удзельнікаў адукацыйнага працэсу;

не дапускаць дзеянняў, якія перашкаджаюць іншым удзельнікам адукацыйнага працэсу выконваць іх абавязкі і рэалізоўваць іх правы ў сферы адукацыі;

беражліва адносіцца да маёмасці Установы;

не дапускаць ўсвядомленага прычынення шкоды свайму здароўю і здароўю іншых асоб;

насіць у вучэбны час школьную форму;

падпарадкоўвацца рашэнням органаў кіравання і самакіравання Установы, прынятым у межах іх кампетэнцыі і якія не супярэчаць заканадаўству Рэспублікі Беларусь.

Іншыя абавязкі навучэнцаў ўсталёўваюцца ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, іншымі нарматыўнымі прававымі актамі Установы.

Падставамі для прыцягнення навучэнца да дысцыплінарнай адказнасці з’яўляюцца супрацьпраўнае, вінаватае (наўмыснае або па неасцярожнасці) невыкананне або неналежнае выкананне абавязкаў, ускладзеных на яго актамі заканадаўства, устаноўчымі дакументамі і іншымі лакальнымі прававымі актамі Установы , у выглядзе наступных дзеянняў (бяздзейнасці):

спазненне або няяўку без уважлівых прычын на вучэбныя заняткі, заняткі, іншыя формы арагнізацыі адукацыйнага працэсу;

парушэнне дысцыпліны;

незахаванне ў перыяд праходжання практыкі рэжыму рабочага часу, вызначанага правіламі ўнутранага працоўнага распарадку адпаведнай арганізацыі;

невыкананне без уважлівых прычын патрабавання педагагічнага работніка, заснаванага на акце заканадаўства, установачным дакуменце або іншым лакальным прававым акце Установы;

абраза ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу;

распаўсюджванне інфармацыі, якая наносіць шкоду здароўю навучэнцаў;

псаванне будынкаў, збудаванняў, абсталявання або іншай маёмасці Установы;

невыкананне (парушэнне) патрабаванняў заканадаўства аб ахове здароўя, пажарнай бяспекі;

распіццё алкагольных напояў, слабаалкагольных напояў, піва, ужыванне наркатычных сродкаў, псіхатропных, таксічных і іншых адурманьваючых рэчываў у будынках і на тэрыторыі Установы або з’яўленне ва ўказаных месцах у стане алкагольнага, наркатычнага або таксічнага ап’янення;

курэнне тытунёвых вырабаў, выкарыстанне электронных сістэм курэння, сістэм для ўжывання тытуню ў памяшканнях і на тэрыторыях, займаемых Установай;

іншых супрацьпраўных дзеянняў бяздзеяння.

172. Да дысцыплінарнай адказнасці прыцягваецца навучэнец, які дасягнуў на момант здзяйснення дысцыплінарнага праступка ўзросту чатырнаццаці гадоў, а навучэнцы з ліку асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця – сямнаццаці гадоў.

173. За здзяйсненне дысцыплінарнага праступка да навучэнца могуць быць прыменены наступныя меры дысцыплінарнага спагнання:

заўвага;

вымова;

датэрміновае спыненне адукацыйных адносін.

174. Меры сацыяльнай абароны навучэнцаў вызначаны Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі.

175. Педагагічнымі работнікамі прызнаюцца асобы, якія ажыццяўляюць педагагічную дзейнасць. Асноўныя патрабаванні, што прад'яўляюцца да педагагічных работнікаў, вызначаюцца кваліфікацыйнымі характарыстыкамі, зацверджанымі ў парадку, устаноўленым актамі заканадаўства.

176. Педагагічныя работнікі ў адпаведнасці з заканадаўствам маюць права на:

абарону прафесійнага гонару і годнасці;

забеспячэнне ўмоў для ажыццяўлення прафесійнай дзейнасці;

творчую ініцыятыву, свабоду выбару педагагічна абгрунтаваных формаў і метадаў навучання і выхавання, сродкаў навучання;

доступ да вучэбна-праграмнай, вучэбна-метадычнай дакументацыі, інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў;

удзел у навуковай, навукова-тэхнічнай, эксперыментальнай, інавацыйнай, міжнароднай дзейнасці Установы;

удзел у конкурсах прафесійнага майстэрства;

удзел у кіраванні Установай;

павышэнне кваліфікацыі;

маральнае і матэрыяльнае заахвочванне за поспехі ў педагагічнай, навуковай, навукова-тэхнічнай, эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці ў сістэме адукацыі;

аб’яднанне ў прафесійныя саюзы, іншыя грамадскія аб'яднанні, дзейнасць якіх не супярэчыць заканадаўству;

штомесячную кампенсацыю расходаў на набыццё вучэбнай і метадычнай літаратуры ў парадку і на ўмовах, якія вызначаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

Іншыя правы педагагічных работнікаў устанаўліваюцца заканадаўствам, іншымі лакальнымі нарматыўнымі прававымі актамі Установы, іх працоўнымі дагаворамі (кантрактамі).

177. Педагагічныя работнікі абавязаны:

ажыццяўляць сваю дзейнасць на прафесійным узроўні, які забяспечвае рэалізацыю адукацыйных праграм, праграм выхавання;

выконваць прававыя, маральныя і этычныя нормы;

паважаць гонар і годнасць навучэнцаў, выхаванцаў і іншых удзельнікаў адукацыйнага працэсу;

павышаць свой прафесійны ўзровень, праходзіць атэстацыю;

прапагандаваць здаровы лад жыцця сярод навучэнцаў;

выконваць спецыяльныя ўмовы, неабходныя для атрымання адукацыі асобамі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця;

праходзіць папярэдні (пры паступленні на працу) медыцынскі агляд і перыядычныя (на працягу працоўнай дзейнасці) медыцынскія агляды ў парадку, які ўстанаўліваецца Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь;

весці прафілактычную і тлумачальную работу па папярэджанні правапарушэнняў сярод навучэнцаў Установы;

выконваць правілы ўнутранага працоўнага распарадку.

Іншыя абавязкі педагагічных работнікаў устанаўліваюцца заканадаўствам, іншымі лакальнымі нарматыўнымі прававымі актамі Установы, іх працоўнымі дагаворамі (кантрактамі).

178. Педагагічныя работнікі не маюць права аказваць платныя кансультатыўныя паслугі па асобных вучэбных прадметах, модулях, вучэбных дысцыплінах, адукацыйных галінах, тэмах, у тым ліку дапамогу ў падрыхтоўцы да ўступных выпрабаванняў (рэпетытарства), навучэнцам.

179. Педагагічным работнікам забараняецца выкарыстоўваць адукацыйны і выхаваўчы працэсы ў палітычных мэтах або для прымушэння навучэнцаў да дзеянняў, якія супярэчаць Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і заканадаўству.

180. Законнымі прадстаўнікамі непаўналетніх навучэнцаў Установы з'яўляюцца іх бацькі, усынавіцелі (удачарыцелі), апекуны, папячыцелі.

Законныя прадстаўнікі непаўналетніх навучэнцаў прадстаўляюць правы і законныя інтарэсы непаўналетніх навучэнцаў у грамадскіх адносінах у сферы адукацыі без спецыяльных паўнамоцтваў.

181. Законныя прадстаўнікі непаўналетніх навучэнцаў маюць права на:

азнаямленне з пасведчаннем аб дзяржаўнай рэгістрацыі, устаноўчымі дакументамі, спецыяльным дазволам (ліцэнзіяй) на адукацыйную дзейнасць, сертыфікатамі аб дзяржаўнай акрэдытацыі, правіламі ўнутранага распарадку для навучэнцаў, а таксама з вучэбна-праграмнай дакументацыяй;

удзел у кіраванні Установай;

абарону правоў і законных інтарэсаў навучэнцаў;

азнаямленне з пасведчаннем аб дзяржаўнай рэгістрацыі, установачным дакументам, спецыяльным дазволам (ліцэнзіяй)

на адукацыйную дзейнасць, сертыфікатамі аб дзяржаўнай акрэдытацыі, правіламі ўнутранага распарадку для навучэнцаў, іншымі лакальнымі прававымі актамі, якія змяшчаюць правы і абавязкі навучэнцаў, а таксама з вучэбна-праграмнай дакументацыяй;

атрыманне інфармацыі аб ходзе і змесце адукацыйнага працэсу, выкарыстоўваемых метадах навучання і выхавання, рэзультатах вучэбнай дзейнасці навучэнцаў у парадку, які вызначаецца кіраўнікам Установы;

атрыманне інфармацыі аб усіх відах абследаванняў (медыцынскіх, псіхалагічных, педагагічных) навучэнцаў.

Іншыя правы законных прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў устанаўліваюцца Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, іншымі актамі заканадаўства, устаноўчымі дакументамі і іншымі лакальнымі нарматыўнымі прававымі актамі Установы.

182. Законныя прадстаўнікі непаўналетніх навучэнцаў абавязаны:

забяспечваць умовы для атрымання адукацыі і развіцця навучэнцаў;

паважаць гонар і годнасць іншых удзельнікаў адукацыйнага працэсу;

забяспечваць выкананне навучэнцамі, законнымі прадстаўнікамі якіх яны з’яўляюцца, патрабаванняў установачных дакументаў, правілаў унутраннага распарадку для навучэнцаў.

ажыццяўляць пераемнасць у выхаванні дзяцей у сям'і і Установе;

Не дапускаецца ўмяшанне законных прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў у выбар педагагічным работнікам метадаў навучання, адпаведных заканадаўству Рэспублікі Беларусь. Выхаванне навучэнцаў забяспечваецца ва ўзаемадзеянні іх законных прадстаўнікоў з педагагічнымі работнікамі.

Законныя прадстаўнікі навучэнцаў у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь нясуць адказнасць за неналежнае выхаванне дзіцяці.

Іншыя абавязкі законных прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў устанаўліваюцца Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, іншымі актамі заканадаўства, Статутам і іншымі лакальнымі нарматыўнымі прававымі актамі Установы.

183. Педагагічныя работнікі, навучэнцы, іх законныя прадстаўнікі ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь нясуць адказнасць за пашкоджанне памяшканняў і будынкаў Установы, вучэбнага абсталявання, інвентару і іншай маёмасці і кампенсуюць нанесеную шкоду.

## ГЛАВА 11
## ВЫДАЧА НАВУЧЭНЦАМ ДАКУМЕНТАЎ

184. Навучэнцы пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, за выключэннем экстэрнаў, праходзяць бягучую, прамежкавую і выніковую атэстацыю па вучэбных прадметах вучэбнага плана Установы.

Парадак атэстацыі ў парадку экстэрнату вызначаецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

185. Атэстацыя вучняў (бягучая, прамежкавая і выніковая) ажыццяўляецца ў мэтах вызначэння адпаведнасці вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў патрабаванням адукацыйных стандартаў і вучэбных праграм.

186. Выніковая атэстацыя па завяршэнні навучання і выхавання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі праводзіцца па выніках выніковай атэстацыі па завяршэнні вучэбных заняткаў у навучальным годзе і выніковых выпрабаванняў па асобных вучэбных прадметах, модулях. Выніковыя выпрабаванні па асобных вучэбных прадметах могуць праводзіцца ў выглядзе цэнтралізаванага экзамену.

Пералік вучэбных прадметаў, модуляў, па якіх праводзяцца выніковыя выпрабаванні па завяршэнні навучання і выхавання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі, віды, формы і тэрміны правядзення выніковых выпрабаванняў, у тым ліку асноўны і іншы тэрміны, рэзервовыя дні правядзення цэнтралізаваных экзаменаў, штогод да пачатку навучальнага года ўстанаўліваюцца Міністэрствам адукацыі.

Навучэнцы праходзяць выніковыя іспыты ў выглядзе цэнтралізаванага экзамену ва ўстановах агульнай сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі, іншых установах адукацыі, якія вызначаюцца Міністэрствам адукацыі ў якасці пунктаў правядзення цэнтралізаваных экзаменаў.

187. Паспяховае праходжанне выніковай атэстацыі за перыяд навучання на ўзроўні агульнай базавай адукацыі дае выпускнікам права на атрыманне пасведчання аб базавай адукацыі, за перыяд навучання на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі – атэстата аб агульнай сярэдняй адукацыі.

Выдача пасведчання аб агульнай базавай адукацыі (пасведчання з адзнакай) рэгламентуецца Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, Правіламі правядзення атэстацыі вучняў пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, зацверджанымі Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Вызваленне навучэнцаў ад вывучэння асобнага навучальнага прадмета не з'яўляецца перашкодай для выдачы пасведчання аб агульнай базавай адукацыі з адзнакай пры выкананні

імі патрабаванняў, прадугледжаных часткай другой гэтага пункта. Навучэнцам, якія былі вызваленыя ад выпускнога экзамену па вучэбным прадмеце, пры выдачы пасведчання аб агульнай базавай адукацыі з адзнакай у якасці выніковай адзнакі па гэтым вучэбным прадмеце ўлічваецца гадавая адзнака.

188. Навучэнцам Установы, якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі, выдаецца атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі (атэстат аб агульнай сярэдняй адукацыі асобага ўзору з узнагароджаннем залатым (сярэбраным) медалём).

Выдача атэстатаў аб агульнай сярэдняй адукацыі (атэстата з адзнакай) рэгламентуецца Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, Правіламі правядзення атэстацыі вучняў пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, зацверджанымі Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Вызваленне навучэнцаў ад вывучэння асобнага навучальнага прадмета не з'яўляецца перашкодай для выдачы атэстата аб агульнай сярэдняй адукацыі асобага ўзору з узнагароджаннем залатым (сярэбраным) медалём пры выкананні імі адпаведных патрабаванняў, прадугледжаных часткамі другой і трэцяй гэтага пункта. Навучэнцам, якія былі вызваленыя ад выпускнога экзамену па вучэбным прадмеце, пры выдачы атэстата аб агульнай сярэдняй адукацыі асобага ўзору з узнагароджаннем залатым (сярэбраным) медалём у якасці выніковай адзнакі па гэтым вучэбным прадмеце ўлічваецца гадавая адзнака.

189. Пры выдачы атэстата аб агульнай сярэдняй адукацыі навучэнцы, якія маюць за перыяд навучання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі прыкладныя паводзіны і па аднаму або двух вучэбных прадметах гадавыя адзнакі 10 (дзесяць) і (або) 9 (дзевяць) балаў, а па іншых вучэбных прадметах гадавыя адзнакі не ніжэй за 6 (шэсць) балаў, узнагароджваюцца пахвальнымі лістамі. Рашэнне аб узнагароджанні навучэнца пахвальным лістом прымаецца кіраўніком Установы ў адпаведнасці з Правіламі правядзення атэстацыі вучняў пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, зацверджанымі Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

190. Узоры, апісанне дакументаў аб адукацыі, прыкладанняў да іх, залатога, сярэбранага медалёў, парадак запаўнення дакументаў аб адукацыі, прыкладанняў да іх, уліку і выдачы дакументаў аб адукацыі, прыкладанняў да іх, залатога, сярэбранага медалёў зацвярджаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь або ўпаўнаважанымі ім органамі.

191. Дакумент аб навучанні - дакумент дзяржаўнага ўзору, які пацвярджае засваенне навучэнцамі атрымання адпаведнай адукацыйнай праграмы, незавершанае засваенне зместу адукацыйных праграм, навучанне ва Установе, якая не прайшла дзяржаўную акрэдытацыю.

192. Дакументамі аб навучанні з'яўляюцца: пасведчанне аб спецыяльнай адукацыі; пасведчанне аб дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі; даведка аб навучанні, інш.

193. Пасведчанне аб спецыяльнай адукацыі выдаецца навучэнцам, якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю.

194. Даведка аб навучанні выдаецца навучэнцам, якія не завяршылі засваенне зместу адукацыйных праграм, або якія навучаліся ва Установе, што не прайшла дзяржаўную акрэдытацыю.

195. Узоры, апісання дакументаў аб навучанні, парадак іх запаўнення, уліку і выдачы зацвярджаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь.

196. Пры датэрміновым спыненні адукацыйных адносін выдаецца даведка аб навучанні ў парадку, які ўстанаўліваецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

197. Датэрміновае спыненне адукацыйных адносін па ініцыятыве Установы з непаўналетнімі навучэнцамі, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі, адкацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, дапускаецца толькі з паведамлення камісіі па справах непаўналетніх Дзяржынскага раённага выканаўчага камітэта, а з непаўналетнімі навучэнцамі, якія засвойваюць змест аднаго з відаў адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі і не засвоілі змест адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, датэрміновае спыненне адукацыйных адносін па ініцыятыве ўстановы адукацыі дапускаецца толькі са згоды камісіі па справах непаўналетніх Дзяржынскага раённага выканаўчага камітэта.

## ГЛАВА 12
## МІЖНАРОДНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

198. Міжнароднае супрацоўніцтва накіравана на атрыманне адукацыі грамадзянамі Рэспублікі Беларусь у арганізацыях замежных дзяржаў, замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства, якія

часова знаходзяцца або часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, ва ўстановах адукацыі Рэспублікі Беларусь, іншых арганізацыях сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь, на абмен навучэнцамі, педагагічнымі работнікамі, а таксама на ўдзел у міжнародных адукацыйных мерапрыемствах.

199. Міжнароднае супрацоўніцтва ажыццяўляецца на аснове міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь.

200. Міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы адукацыі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з актамі заканадаўства на прынцыпах незалежнасці, роўнасці, узаемнай выгады, узаемнай павагі і не павінна наносіць шкоду суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, нацыянальнай бяспекі і інтарэсам асобы, грамадства і дзяржавы.

## ГЛАВА 13
## ПАРАДАК РЭАРГАНІЗАЦЫІ І ЛІКВІДАЦЫІ УСТАНОВЫ

201. Рэарганізацыя і ліквідацыя Установы, ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі і іншымі актамі заканадаўства.

Рэарганізацыя і ліквідацыя Установы ажыццяўляецца, як правіла, пасля заканчэння навучальнага года.

202. Рашэнне аб ліквідацыі Установы прымаецца Заснавальнікам на падставе ацэнкі наступстваў такой ліквідацыі з улікам колькасці асоб, якія падлягаюць навучанню на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі на тэрыторыі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, і колькасці дзяржаўных устаноў, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі на гэтай тэрыторыі.

203. У выпадку спынення дзейнасці Установы, анулявання, спынення дзеяння спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) на адукацыйную дзейнасць Установы, Упраўленне прымае меры па пераводу навучэнцаў з іх згоды, згоды законных прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў у іншыя ўстановы адукацыі, якія рэалізуюць адпаведныя адукацыйныя праграмы, у парадку, які ўстанаўліваецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 14
## ПАРАДАК УНЯСЕННЯ ЗМЯНЕННЯЎ І (АБО) ДАПАЎНЕННЯЎ У СТАТУТ

204. Змены і (або) дапаўненні ў Статут ўносяцца ў парадку і на ўмовах, устаноўленых дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і Палажэннем аб дзяржаўнай рэгістрацыі суб'ектаў гаспадарання.

205. Змены і (або) дапаўненні, што ўносяцца ў Статут Установы, лічацца зарэгістраванымі з даты прастаўлення штампа на гэтых зменах і (або) дапаўненнях і ўнясення запісу аб іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў Адзіны дзяржаўны рэгістр юрыдычных асоб.

## ГЛАВА 15
## ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

206. Установа абавязана пацвярджаць сваю дзяржаўную акрэдытацыю ў парадку, устаноўленым Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, Палажэннем аб парадку правядзення дзяржаўнай акрэдытацыі ўстаноў адукацыі, іншых арганізацый, якім у адпаведнасці з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць.

Пацвярджэнне дзяржаўнай акрэдытацыі з'яўляецца падставай для захавання за Установай праў на выдачу выпускнікам дакументаў аб адукацыі.

207. Від установы адукацыі можа быць зменены. Рашэнне аб змене віду ўстановы адукацыі прымаецца Заснавальнікам па ўласнай ініцыятыве або па ініцыятыве ўстановы адукацыі пры сукупнасці ўмоў.